С.Я. Новікаў

# НЯМЕЦКІ ПОГЛЯД НА БАІ ЗА КРЭПАСЦЬ У БРЭСТ-ЛІТОЎСКУ ЛЕТАМ 1941 ГОДА

У артыкуле на аснове новых нямецкіх гістарыяграфічных крыніц паказаны асноўныя падзеі абароны крэпасці ў Брэсце (паводле нямецкіх дакументаў, у Брэст-Літоўску) летам 1941 года. Аўтар аднаўляе агульную карціну баёў на брэсцкім абарончым плацдарме, ставячы ў цэнтр увагі новыя факты і вызначаючы характар двухбаковых баявых дзеянняў на этапе нямецкага штурму і арганізаванай савецкай абароны крэпасці, выкарыстоўваючы малавядомыя звесткі, атрыманыя з арыгінальных нямецкіх дакументаў.

Зварот да нямецкіх крыніц у працэсе даследавання гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці на цяперашні час больш чым неабходны. Дзякуючы погляду праз фотакамеру салдата 45-й пяхотнай дывізіі вермахта, у чэрвені 1941 года, штурмуючай крэпасць у Брэсце, праз 70 гадоў на месцы былой варонкі ад снарада нямецкай марціры "Карл" удалося выявіць рэшткі 58 чырвонаармейцаў, якія загінулі ў першыя дні вайны на тэрыторыі крэпасці [1]. Гэты факт у чарговы раз даказвае, што нямецкія дакументы маюць непераходную каштоўнасць, хаця гісторыку любы дакумент нельга пакідаць без крытычнай ацэнкі і навуковай экспертызы.

Аб трактоўцы падзей пры ўзяцці Брэст-Літоўска можна меркаваць па некаторых агульных і спецыяльных працах у нямецкай гістарыяграфіі [2; 3; 4; 5; 6; 7; 8; 9]. Галоўным, што аб'ядноўвае гэтыя працы, з'яўляецца факт звароту да даня-сення 45-й пяхотнай дывізіі вермахта аб ходзе баявых дзеянняў пры ўзяцці Брэсцкай крэпасці. Нямецкі дакумент утрымлівае важныя звесткі ў дачынен-ні да храналогіі нямецкага штурму, працягласці арганізаванай савецкай аба-роны, пытання аб колькасці чырвонаармейцаў і іх камандзіраў, хто да закан-чэння абароны патрапіў у нямецкі палон, агульнай карціны страт у жывой сіле з нямецкага і савецкага бакоў і інш.

Аднак шлях гэтага дакумента [10, Bl. 1–11] да нямецкага чытача быў не менш кароткім, чым у айчыннай гістарыяграфіі. У германскай гістарычнай навуцы працэс назапашвання ведаў аб баявых падзеях у час баёў на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці таксама расцягнуўся на многія дзесяцігоддзі. Хаця для даследчыкаў Германіі з пачатку 1960-х гадоў практычна адсутнічалі перашкоды па выкарыстанні крыніцы, аднак нямецкімі гісторыкамі таксама доўгі час не было праведзена комплекснага даследавання гэтай праблемы. Штурм крэпасці 45-й пяхотнай дывізіяй адразу па некалькіх прычынах апынуўся ў пераліку другарадных фактаў гісторыі германскага вермахта на Усходнім фронце нават пры тым, што ў першы дзень штурму крэпасці Брэст-Літоўск былі панесены страты, роўныя 2 % ад усіх страт сухапутных войск вермахта на Усходнім фронце да канца чэрвеня 1941 г. [11, S. 276 ]. Паведамленне аб маланкавым узяцці крэпасці чакала не толькі камандаванне 12-га армейскага корпуса, колькі камандуючы 4-й арміі фельдмаршал фон Клюге, які не развітваўся з ідэяй данесці фюрэру аб паспяховым пачатку "бліцкрыгу" на паўднёвым флангу наступлення групы армій "Цэнтр". Аднак "бліцкрыг" пацярпеў поўны правал на абарончым рубяжы ў Брэсцкай крэпасці ў першы ж

дзень вайны. Таму падзея адразу ж выпала не толькі з высокіх рапартаў, але і набыла характар другараднай у германскай гістарыяграфіі. У выніку вартая асобнай увагі нямецкіх даследчыкаў старонка вайны, насычаная напружаннем упартай барацьбы на тэрыторыі крэпасці ў Брэст-Літоўску, апынулася адсунутай на задні план і ў германскай гістарычнай навуцы.

Аналіз навуковых прац па гэтай праблематыцы ў пасляваеннай германскай гістарыяграфіі паказвае, што пачатак вывучэнню асобных падзей у Брэст-Літоўску быў пакладзены работай, выдадзенай у 1955 годзе ў аўстрыйскім Лінцы былым дывізійным каталіцкім святаром Р. Гшопфам. Распавядаючы аб падзеях у ходзе штурму цытадэлі на р. Буг, аўтар вядзе агульны расказ, не выходзячы за рамкі вядомага данясення камандзіра 45-й дывізіі. Важнымі ў кнізе з'яўляліся матэрыялы аб галоўным аб'екце сваёй службы – дывізійных стратах, у тым ліку забітых, параненых і зніклых без вестак удзельніках штурму крэпасці. У якасці зыходных дакументаў аўтар выкарыстоўвае захаваныя копіі пахавальных паведамленняў, адпраўленых ім самім у чэрвені і пачатку ліпеня 1941 г. з Брэст-Літоўска. На аснове звестак дывізійнага святара атрымлівалася, што агульная колькасць страт у ходзе шматдзённага штурму дасягае амаль паўтары тысячы чалавек, з якіх забітых было 482 чалавекі [2, S. 158].

У пачатку 1980-х гадоў тэма штурму Брэсцкай крэпасці цалкам замоўчвалася, шматдзённым баявым дзеянням 45-й пяхотнай дывізіі вермахта ў Брэст-Літоўску фактычна не адведзена ніводнага радка ў спецыяльным фундаментальным даследаванні "Трэці рэйх і Другая сусветнай вайна" [3, S. 452]. Толькі ў канцы 80-х аб баявых падзеях у Брэсце практычна ўпершыню звяртаецца берлінскі даследчык П. Коль. У сваёй працы, створанай на аснове розных дакументаў, у тым ліку ўспамінаў відавочцаў тых падзей, аўтар зыходзіць галоўным чынам з савецкай канцэпцыі абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 года. З кнігі вынікаюць агульнавядомыя тэзы. Напярэдадні вайны ў цытадэлі знаходзіўся гарнізон агульнай колькасцю каля 8 тысяч чалавек. На момант пачатку нямецкага штурму ў крэпасці заставалася каля 3,5 тысяч чалавек. Крэпасць вяла абарону 28 дзён, г.зн. амаль месяц. Да таго часу часці вермахта захапілі Смаленск і прасоўваліся далей на ўсход у напрамку на Маскву. Толькі 20 ліпеня крэпасць пала [4, S. 28; 5, S. 35].

Своеасаблівае адлюстраванне гісторыі штурму ўмацаванняў Брэсцкай крэпасці 45-й пяхотнай дывізіяй [6, S. 258–267] знаходзіць у навуковым даследаванні мюнхенскага ваеннага гісторыка К. Хартмана. У сваёй фундаментальнай працы "Вермахт на Усходзе" аўтар дае аналіз баявой дзейнасці дывізіі, зыходзячы пры гэтым з шырокай базы дакументаў Федэральнага ваеннага архіва ў Фрайбургу і Архіва сучаснай гісторыі ў Мюнхене, а таксама іншых крыніц. Пры гэтым галоўную ўвагу гісторык надае не нямецкім, а савецкім стратам, прыводзячы ў якасці доказаў лічбу, атрыманую метадам вылічэння савецкіх ваеннапалонных ад агульнай колькасці дзвюх савецкіх стралковых дывізій – 6-й і 42-й (у кнізе памылкова ўказана 28-я стралковая дывізія. – **С.Н.**), якія складалі агульны баявы штат у 18 600 чалавек. На наш погляд, гісторыкам дакументальна не даказана тэза аб тым, што з іх 11 400 чырвонаармейцаў

загінулі ў ходзе абароны Брэсцкай крэпасці. Аўтар новай нямецкай працы адзначае, што звыш за 7 200 з тых, хто застаўся ў жывых, апынуліся ў нямецкім палоне [6, S. 263]. Пры гэтым аўтар асобна вылучае факты таго, што абаронцы крэпасці вялі ўпартыя баі, дзейнічалі бясстрашна, смела і ўпарта.

Асобнае значэнне для аб'ектыўнага вывучэння гісторыі баявых дзеянняў у Брэсцкай крэпасці на сучасным этапе маюць новыя публікацыі і матэрыялы даследавання гамбургскага гісторыка К. Ганцара. На аснове з аднаго боку нямецкіх дакументальных крыніц, а з другой – дакументальных матэрыялаў з фонду Мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой" нямецкі гісторык крытычна падыходзіць да практычна ўсіх існуючых на цяперашні час выданняў. Нямецкі даследчык не абыходзіць маўчаннем і кнігу расійскага гісторыка Р.В. Аліева "Штурм Брэсцкай крэпасці" [7, с. 36–37]. Але ключавую ролю ў пытанні даследавання гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці адыгрывае яго найноўшая навуковая распрацоўка "Брэсцкая крэпасць у святле нямецкіх дакументаў 1941 года" [9]. У сваім новым матэрыяле гісторык закранае новыя аспекты пытання як нямецкага штурму крэпасці ў Брэст-Літоўску, так і савецкай абароны, выкарыстоўваючы новыя архіўныя дакументы і найноўшыя гістарыяграфічныя факты.

У першым выпадку аўтар прыходзіць да высновы, што за час знаходжання 45-й дывізіі ў Брэсце агульная колькасць нямецкіх страт складала 421 чалавек (85 % ад агульнай колькасці нямецкіх страт), пры гэтым 358 з іх былі забітыя ці памерлі ад раненняў у лазарэце цягам першых трох дзён, адпаведна: у першы дзень – 281 чалавек, у другі – 23, у трэці – 54 чалавекі. Пры гэтым аўтар адзначае, што асноўныя страты пасля 26 чэрвеня складалі памерлыя ад цяжкіх раненняў, а не загінулыя ў ходзе баявых дзеянняў на тэрыторыі крэпасці. Пачынаючы з 5-га дня штурму цытадэлі на яе тэрыторыі немцы не неслі чалавечых страт [9, с. 2].

Звяртаючыся да пытання аб савецкіх ваеннапалонных, К. Ганцар прыводзіць пераканаўчыя дакументальныя даныя аб фактычнай колькасці чырвонаармейцаў, якія апынуліся ў нямецкім палоне з 22 па 30 чэрвеня. На аснове архіўных дакументаў атрымліваецца, што большая частка з 9 000 савецкіх абаронцаў, якія знаходзіліся ў крэпасці на момант пачатку нямецкага штурму, у палоне да канца месяца апынулася ад 5 да 6 тысяч чалавек. Пры гэтым аўтар прыводзіць дзве крайнія лічбы: мінімальную лічбу, роўную 4 881 ваеннапалоннаму, і максімальную – 6 021 чалавеку. Даследчык падкрэслівае, што цягам першых трох дзён у нямецкім палоне апынулася кала 80 % усіх абаронцаў крэпасці [9, с. 3]. Гэта становіцца для нямецкага даследчыка асновай для вываду пра тое, што цяжкія баі за крэпасць штурмуючымі вяліся на працягу толькі першых трох дзён. Два наступныя дні ў дакументах яшчэ згадваюцца як вядзенне баёў у асобных ачагах супраціўлення на тэрыторыі крэпасці, пасля чаго размова ідзе толькі аб Усходнім фронце, дзе трымаў абарону маёр П. Гаўрылаў са сваімі падначаленымі. Па дакументах, вядомых на гэтым этапе нямецкаму гісторыку, сам Гаўрылаў апынуўся ў палоне не на 32-і, як прынята лічыць у айчыннай гістарыяграфіі, а на 33-і дзень, г. зн. баявы камандзір патрапіў у нямецкі палон на суткі пазней – 24 ліпеня 1941 года.

Нямецкі гісторык сцвярджае, што пасля захопу крэпасці ў выяўленых на цяперашні час дакументах яму пакуль не сустракаліся факты аб тым, што ў крэпасці працягвалася "арганізаванае баявое супраціўленне" [9, с. 4]. Няма доказаў і пра 32-дзённую абарону крэпасці. Баі за крэпасць з нямецкага боку былі завершаны 29 чэрвеня 1941 года, паколькі ў пачатку ліпеня дывізія адбыла на новае месца дыслакацыі. К. Ганцар перакананы, што лёс кожнага з савецкіх ваеннапалонных заслугоўвае таго, каб і гэта катэгорыя абаронцаў была вернутая ў пантэон гістарычнай памяці народа.

Такім чынам, германская гістарыяграфія баёў за крэпасць у Брэст-Літоўску летам 1941 г. таксама не пазбаўлена фрагментарнасці і схематызму. Нямецкім гісторыкам таксама не ўдалося да гэтага часу правесці комплекснае даследаванне падзей у крэпасці з адлюстраваннем адначасова як нямецкага штурму, так і савецкай абароны. Рашэнне гэтых актуальных задач, на наш погляд, магчыма ўжо ў бліжэйшы час шляхам правядзення сумеснага беларуска-германскага даследавання [8, S. 81–96]. Такі падыход, пабудаваны на аснове параўнаўчага метаду, дазволіць не толькі наблізіць два процілеглыя погляды, але і вырашыць шэраг складаных пытанняў пры напісанні поўнай, усебаковай і, галоўнае, аб'ектыўнай гісторыі падзей у Брэсцкай крэпасці ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

ЛІТАРАТУРА

1. В Брестской крепости обнаружены останки десятков солдат Красной Армии [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://naviny.by/rubrics/society/2011/10/28/ ic_news_116_379484/. – Дата доступу : 31.01.2012.

2. *Gschöpf, R.* Mein Weg mit der 45. Infanterie-Division / R. Gschöpf. – Linz, 1955.

3. Das Deutsche Reich und der Zweiter Weltkrieg. Bd. 4 : Der Angriff auf die Sowjetunion / hrsg. vom Militärgeschichtlichen Forschungsamt. – Stuttgart, 1983.

4. *Kohl, P.* Ich wundere mich, dass ich noch lebe: sowjetische Augenzeugen berichten / P. Kohl. – Gütersloh, 1990.

5. *Kohl, P.* Der Krieg der deutschen Wehrmacht und der Polizei 1941–1944: sowjetische Überlebende berichten / P. Kohl. – Frankfurt a.M., 1995.

6. *Hartmann, Ch.* Wehrmacht im Osten. Front und militärisches Hinterland 1941/42 / Ch. Hartmann. – München, 2009.

7. *Ганцар, К.* Штурм Брэсцкай крэпасці / К. Ганцар. – Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 6.

8. *Ganzer, Ch.* Heldentum, Tragik, Tapferkeit. Das Museum der Verteidigung der Brester Festung / Ch. Ganzer, A. Paskovich // Osteuropa. – 2010. – Nr. 10. – S. 81–96.

9. *Ганцер, К.* Бои за Брестскую крепость в свете немецких документов 1941 года / К. Ганцер // Историческое наследие сорок первого года в исследованиях и экспозициях музеев: международная научно-практическая конференция, Мемориальный комплекс «Брестская крепость-герой», 9–10 июня 2011 г. (архіў аўтара).

10. Ваенны архіў Германіі (далей – BA-MA): RH 26–45/27: Gefechtsbericht über die Wegnahme von Brest-Litowsk, v. 8.07.41. – Bl. 1–11.

11. *Overmans, R.* Deutsche militärische Verluste im Zweiten Weltkrieg / R. Overmans. – München, 1999

*Поступила в редакцию 13.02.12*